


# ВЯСЁЛАЯ КАЗКА НА СУР'ЁЗНУЮ ТЭМУ

**У Выдавецкім доме «Звязда» *(Мінск, 2026)* выйшла чарговае літаратурна-мастацкае выданне, адрасаванае маленькім чытачам. Яго аўтар Людміла Кебіч. Новая казка Людмілы Антонаўны атрымала назву «Як коцікі-брацікі малую радзіму шукалі».**

У анатацыі да кнігі гаворыцца: *«У казцы Людмілы Кебіч распавядаецца, як кацяняткі Цёмка і Дзёмка даведаліся пра тое, што ў кожнай істоты на Зямлі ёсць малая радзіма, і адправіліся на пошукі. Цікаўныя чытачы даведаюцца, якія перашкоды і прыгоды сустрэліся ім падчас вандроўкі, а таксама пра тое, як коцікі-брацікі абаранялі свой родны куточак ад ворагаў, як усвядомілі, што значыць для кожнага родны край, як трэба шанаваць і любіць яго. Для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту».*

У казцы, выдадзенай асобнай кнігай, шмат цікавага нават для дарослых – бацькоў, педагогаў, тых, хто дапаможа дзіцячай аўдыторыі падрабязна пазнаёміцца з захапляльным сюжэтам. Напрыклад, вось як Людміла Антонаўна апісала момант, калі героі даведваюцца аб існаванні ўва ўсіх малой радзімы: «Аднойчы ў суботу, калі дзед паехаў на кірмаш у суседняе сяло, бабуля ўключыла тэлевізар і затрымалася на цікавай праграме: вядучы Ігар Мурмяўлюк распавядаў пра беларускія нацыянальныя каштоўнасці і даволі часта ўпамінаў пра малую радзіму. Коцікі-брацікі прыслухаліся і зацікавіліся яго аповедам».

Кампазіцыя казкі складаецца з глаў: «Цікавая навіна»; «У лесе»; «Сустрэча з мышшу»; «Як коцікі-брацікі малую радзіму абаранялі»; «Бой з лісой»; «Як жыхары падворка святкавалі перамогу». Выданне багата ілюстравана, *мастак Валерыя Лукашык.* У кнізе 32 старонкі, пераплёт мяккі. Тыраж 1000 экзэмпляраў. Калі ласка, пытайцеся навінку ў кніжных крамах і бібліятэках.